Цана асобнага нумару 20 гр.

Przesyłka opłacona ryczałtem

№ 36 Вільня, Субота 14 Сьнежня 1929 г. Год V (XIII).

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno. Ludwisarska 1-19) Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. да 4 гадз. веч.

„Бел. КРЫНІЦА“ каштуе на год—6 зл., на паўгода — 3 зл., на 3 месяцы — 2 зл.. ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Цана абвестак: на 1-шай старонцы 60 гр., 2 і 3 — 50 гр., на 4-ай — 40 грш. — за радок дробнага друку ў адной шпальце

Цяжкое палажэньне нашай вёскі.

З прыходам да ўлады марш. Пілсудзскага, шмат хто з нашых вяскоўцаў думаў, што ўрэшце настане сякая такая перамена і жыцьцё стане лягчэйшым. Аднак ужо першыя крокі марш. Пілсудзкага (Несьвіж, Дзікаў) паказалі, што больш яго інтэрэсуе абшарніцтва і прамысловыя кругі, чым сялянства. Аб вёсцы забыліся, а калі і помнілі, дык толькі тагды, калі трэба было з яе сьцягнуць падатак на агульна дзяржаўныя патрэбы.

Столькі разоў абяцаная зямельная рэформа асталася толькі на паперы, або застыла на вуснах урадавых кругоў. Цана зямлі дайшла да таго ў гару, што цяпер плацяць за зямлю да 300 і больш даляраў гэктар. Хто-ж можа яе купіць? Хіба толькі амэрыканец або які капіталіст. А дзе дзецца беднаму чалавеку? Астаецца ісьці ў прочкі або галадаць. Ня хочучы галадаць, наш чалавек рвецца за граніцу: у Францыю, у Аргентыну, абы толькі выехаць з гэтай закаркаванай бутэлькі, якой аказаўся наш край, хоць праўду кажучы і там заграніцай нявялікае шчасьце. Тыя-ж, што маюць кавалак зямлі і хацелі-б з яе пражыць, ня могуць ніяк зьвязаць канца з канцом, бо адзіны іх даход—збожжа і бульба ацэньваюцца цяпер вельмі нізка. Вось затым наракаюць ня толькі беззямельныя і малазямельныя, але нават сяляне валочнікі, якія здаецца маглі-б жыць без нараканьня. Уважаем, што вінаватымі ёсьць у гэтым трудным палажэньні сялянства кіраўнікі гаспадарчай палітыкі, якія ня ўмелі пакіраваць збажовай гаспадаркай на карысьць сялянства. Яшчэ больш стане яснай крыўда сялянства, калі мы параўняем цэны вырабаў фабрычных з цэнамі вясковых прадуктаў: вясковыя прадукты цяпер на палавіну танейшыя за фабрыкаты. За пуд жыта мы цяпер мала што купім.

Але ня толькі ў збажовай гаспадарцы праяўляецца няўмеласьць кіраваньня гаспадарчай палітыкай, яна відаць так-жа ў лясной гаспадарцы. Лес—гэта вялікае багацьце нашага краю. За яго можна дастаць з заграніцы і солі і карасіны і жалеза і розныя машыны. Пры разумнай гаспадарцы лесу хваціла-б на доўгія гады ня толькі для краёвых патрэб, але і на вываз. Тымчасам, што зрабіла з яго польская гаспадарка?

Паводле статыстыкі Віленскай Прамыслова-гандлёвай Палаты, абымаючай 4 ваяводзтвы: Віленск., Наваградзк., Палескае і Беластоцкае, лясны абшар, заняты пад іглястым дрэвам (сасна, ёлка) раўняецца 280.000 га, з гадавым прыростам на гэтым абшары 840 000 куб. мэтраў (фэстмэтраў). Здаецца, што на добры гаспадарскі розум трэба сто́лькі высякаць, сколькі прырастае, тымчасам высекалі ня 840.000, а 2.000.000 фэстмэтраў у год, значыць—два з паловай разоў больш чым можна было! Затым лесу ўжо мала, гэты, каторы яшчэ астаўся, вельмі дарагі, цана даходзіць да 80 зл. за фэстмэтр у кругляку! Дакупіцца да яго трудна беднаму чалавеку. А бяз лесу, як жыць? Чым тапіць, з чаго пабудавацца? Праўда, цяпер на наш лес заграніцай ужо ня вельмі кваляцца, бо асталася адна брыда, а пакуль новы нарасьце, пройдзе нямала часу. У гэтым таксама вінаваты тыя гаспадарчыя кіраўнікі, якія пазвалялі вясьці рабункову лясную гаспадарку. А калі яшчэ сюды дабавім рожныя труднасьці ў самаўрадах і бел. школьніцтва, розныя падаткі, якія мусіць плаціць наш селянін, пры гэтым і штрафы за сабак, нялелзаныя коні і г. д., — мы можам сабе прадставіць, у якім цяжкім палажэньні знаходзіцца наша вёска. Сапраўды, цяперашняе палажэньне нашай вёскі куды труднейшае, чым яно было ў далёкай і бліжэйшай прошласьці. Затым не памыліліся беларускі і украінскі пасольскія клюбы, уносячы ў сойм прапазыцыю выразіць недавер ураду п. Сьвітальскага, ідэолёгам якога ёсьць марш. Пілсудзкі. Урад п. Сьвітальскага ўступіў.

А што нам рабіць?

Арганізавацца, заяўляць аб сваіх патрэбах і правох да лепшага жыцьця; здабываць пазыцыю за пазыцыяй у самаўрадах, школьніцтве і культурным жыцьці; не маўчаць, падаваць у газэты аб усіх крыўдах; гуртавацца каля палітычных і культурных устаноў, якія стаяць на незалежніцкім грунце. Запамятайма, што ніхто нам ня дасьць лепшай долі, калі мы яе самы не здабудзем

Каб не разьмінуцца з праўдай.

Алёна Ромэр нялежыць бязумоўна да ліку тых людзей, што ўмеюць падглядзіць жыцьцёвыя праявы і маюць часам адвагу „назваць рэчы па іменьню“. І таму з-пад ейнага пяра час ад часу выходзяць рэчы сусім цікавыя, а нават важныя. Да ліку такіх рэчаў належыць і артыкул „Opory zbrodniczości“, зьмешчаны ў № 252-29 „Kur. Wil.“, у якім Ромэр займаецца стала ўзрастаючым праступніцтвам на белерускай вёсцы, ставячы ў прыклад гэту апошнюю з прадвеаных часаў пад маральным узглядам усяму амаль сьвету. І гэта вёска сягоньня аднак топіцца ў заразе праступніцтва!

Гэта вёска, шэрыя народныя массы. А інтэлігенцыя? Тая жыве на тое. каб „розную справу, рэч, асобу, інстытуцыю, гістарычны ўспамін або пісьменьнікаў паніізіць, аплявацы, агідзіць у вачах шырокіх кругоў, моладзі, выясьняць і ў балота ўтаптаць розную ясьнейшую хвілінку, ваўком глядзець на кожны пагоднейшы твар... Што можа некаму рабіць прыемнасьць бязупыннае купаньне ў зависьці, брудах, злосьці і неахвоце, гэта ёсьць аб'яваж аднолькава нездаровым і грозным, як праступніцтва вёскі“.

Да гэткіх высноўкаў дайшла п. А. Р. прыглядаючыся да судовай працэдуры, караючай у нас 14-цю месяцамі турмы за размыснае айцабойства, да сучаснай прэсы, тэатру, кіна, кніжкі, абразу, разьбы, словам усяго, што пхае ў рукі, у вочы, у памяць праступак, простытуцыю, зладзейства, мукі, забойства, ненавісьць, гвалт і г. д. Усё гэта ёсьць „другая фаля вайны, гэта дасьпелы плод раду гадоў узаемнага забіваньня“, бо пасьля вайны „асталіся ў грамадзянстве разбойніцкія зародкі, нахіл да крыміналу (турмы), смак крыві, ран і трупаў...“ і г. д. Усё гэта мусіла зьявіцца нейдзе выхад, мусіла выбіцца ў кніжках, кінах, тэатрах...

І выбілася, бо вось каталіцкі (польскі) пісьменьнік Розтвароўскі піша драму, дзе выводзіць бацькоў, забіваючых свайго ўласнага сына. Другі Паляк К. Бандроўскі выпускае ў сьвет кніжку „Czarne skrzydła“, апісуючую найстрашнейшых людзкіх вырадкаў. І першы і другі пісьменьнікі за назваўныя кніжкі дасталі нагароды. Сьведчыць гэта вельмі вымоўна аб „густах“ польскіх чытачоў; зайздравацьняма чаго.

Гэтак прадстаўляецца справа праз польскія акуляры. Нас Беларусаў яна-б і ня цікавіла, каб ня была тут матэр'ялам беларуская вёска, інтарэсы і лёсы якой ляжаць нам на сэрцы перадусім.

Гаворыцца аб праступніцтве нашай вёскі і інтэлігенцыі (беларуска-несьвядомай) і падаюцца прычыны, сказаць трэба — трафныя, але ня поўныя, як што да нашай вёскі, так і што да інтэлігенцыі. У вясковага элемэнту прапушчаны мамэнт усьведамленьня социяльнай несправядлівасьці, а ў інтэлігенцыі... — нястача інтэлігенцыі. Вёска, пазнаўшы крыўду сваю, навучылася(!) праваў сваіх дахадзіць і бараніць; усё роўна, якім спосабам, абы толькі на сваім паставіць, да свайго дабіцца. Кіраваная пры гэтым сваім толькі натуральным інстыктам— доступ да праўдзівай культуры нашай вёсцы сягоньня так як і немагчымы — мусіла азьвярэць і ў шмат выпадках азьвярэла. Дапамагла ей (вёсцы) ў гэтым інтэлігенцыя, на якую вёска прывыкла глядзець, як на прыклад да насьледаваньня. А тымчасам? Тымчасам гэта інтэлігенцыя кідае часта цень найбрыдшага згаршэньня, бо выключнай амаль стравай гэтай інтэлігенцыі стаўся розум: той саму „розум“, які пакінены самому сабе гнаў і гоне да брата — айцабойства. Ясна, што такая „інтэлігенцыя“, гэта сапраўды пабяляны гроб. Яна гіне сама і туды-ж даводзіць тых, хто на яе аглядаецца.

З усяго гэтага вывад такі: калі хто сапраўды хоча спыненьня расшырыўшайся пошасьці праступніцтва, мусіць прызнаць, што вёсцы нашай трэба запэўніць варштат працы (надзяліць яе зямлёй, а не даваць зямлі чужым асаднікам), а інтэлігенцыі — магчымасьць цьвічыць ня толькі голы розум, але і сэрца: прывясьці яе да пазнаньня Бога, якога з сэрца свайго даўно — даўно выкінула. Надзелам зямлі разьвяжыцца найгалўнейшая прычына, пхаючая нашага селяніна ў апошнюю бяду і голад, а тымчасам і ў праступак. Шчыры-ж узноў зварот інтэ-

лігенцыі да вызнаваньня праўд наднатуральных, боскіх верне ей правы быць інтэлігенцыяй сапраўднай, быць **мазгамі свайго народу**.

Бяз гэтага трывалкая направа немагчыма і гэта мы хацелі тут зазначыць.

Пры мейсцы будзе зазначыць і тое, што абодва павышшыя пункты зьяўляюцца праграмовымі Беларускай Хрысьціянскай Дэмократыі (БХД) і ейнага органу „Беларускай Крыніцы“. Б. Х. Д. за гэта стойка і неўгамонна змагаецца і таму за апошні асабліва год набыла гэтульки непрыяцеляў, бароняючыхся перадусім проці надзелаў сялянства зямлёй. Хто хоча Бога насіць у сэрцы, а жыцьцё дачаснае правясьці і закончыць пры чэснай працы на ўласным куску зямлі, той мусіць сам стацца сябрам БХД, чытаць „Беларускую Крыніцу“ і другіх да гэтага заахвочываць. Чым больш нас будзе, будзем сільнейшымі і тым хутчэй дойдзем да сваей мэты.

В. К.

З літоўска-беларускіх адносін.

(Да 400-лецьця Літоўскага Статуту.)

Як пісалі мы ў прошлым нумары „Бел. Крыніцы“, 400-ыя ўгодкі Літоўскага Статуту 30.XI с. г. сьвяткавала ўсё беларускае грамадзянства, адзначаючы гэты рэдкі юбілей у прэсе, а так-жа ладзячы ўрачыстыя паседжаньні з адпаведнымі прамовамі і рэфаратамі. Вось-жа юбілей гэты сьвяткавала такжа група беларускіх санатараў (полёнофілаў), якая ў дзень 30 лістапада ў салі Віл. Бел. Гімназіі арганізавала аж тры лекцыі разам. Ант. Луцкевіч гаварыў аб тагочасных варунках грамадзкіх, А. Зянюк разважаў Літоўскі Статут з боку праўнага і ўрэшце Янка Станкевіч — з боку мовы. Учасьнікаў гэтага сьвяткаваньня было дужа мала. З беларускага грамадзянства, апрача групы санатараў і вучняў Віл. Бел. Гімназіі, ня было бадай нікога.

Відаць дзеля цікавасьці на гэны вечар трапіў літоўскі корэспандэнт, які свае ўражаньні апісаў у віленскай літоўскай газэце „Vilniaus Rytojus“ з дня 7 сьнежня с. г. З гэнага апісаньня даведваемся, што ўсе тры прэлегенты, гаворачы аб Літоўскім Статуце з 1529 г. былі больш менш аднабокія, бо Статут гэны, як з боку грамадзкага, так з боку праўнага і філёлёгічнага ўважалі яны за выключны прадукт беларускі. Вось-жа ў імя гістарычнай праўды мусімо адзначыць, што Літоўскі Статут, гэны першы кодэкс права Вялікага Княства Літоўскага, у склад якога апрача Літоўцаў уваходзілі, як ведама, Беларусы і Украінцы, трэба лічыць за твор супольны, за твор народу беларускага, літоўскага, а адчасьці і ўкраінскага. Гэны кодэкс становяць апрача рожных даўнейшых правоў пісаных, так-жа і права звычаёвае ўсіх трох народаў, складаючых адну дзяржаву Вялікага Княства Літоўскага. У Статуце Літоўскім такім чынам мы знаходзім частку душы ўсіх трох гэтых народаў, а прадусім душы беларускай і літоўскай, як народаў, жывучых каля свайго палітычнага і культурнага асяродка Вільні, ад якога украінцы былі, рэч ясная, далей.

Аднабокасьць-жа санацыйных прэлегентаў трэба, думаем, прыпісаць іх сучасным палітычным паглядам. У тым-жа і сутнасьць іх полёнофільства, каб, разьбіваючы нашу палітыку, падыктаваную гісторыяй, палітыку лучнасьці народаў: беларускага, літоўскага і ўкраінскага, палітыку вялікай фэдэрацыі вольных і незалежных народаў ад Балтыку да Чорнага мора,—падтрымліваць тут польскія ўплывы.

З другога-ж узноў боку мыляецца цалком корэспондэнт „Viln. Rytojus,“ калі цьвердзіць, што Літоўскі Статут напісаны быў у мове *царкоўна-славянскай*, якая тагды бадай была літэратурнай мовай усходніх і паўдзённых славян. Вось-жа ў першых вякох літоўска-беларуска-украінскага аб'яднаньня, у вякох XIII XIV, адчасьці ў XV сапраўды было так, але ў веку XVI ужо было інакш. У гэтым часе мова царкоўна-славянская ацышла бадай цалком да жыцьця рэлігійнага, а на месца яе паўсталі ўжо мовы беларуская і ўкраінская, а далей на поўначы і ўсход паўставала мова расейская. І вось-жа з аднаго боку агулам славянская блізшасьць у Вял. Кн. Літоўскім, а з другога блізкасьць Беларусі да культурнага і палітычнага цэнтру дзяржавы—Вільні, зрабілі тое што ўрадавай мовай і ў жыцьці сьвецкім мовай літэратурнай сталася агулам мова беларуская. У гэтай-жа мове і напісаны як першы Літоўскі Статут, так і два другія. Але яшчэ гэты факт не дае нам права Літоўскія Статуты ўважаць за выключна беларускія творы. Адна толькі мова, рэч ясная, не дэцыдуе аб самай істоце данага твору.

З гэтага ўсяго пакульшто можым зрабіць толькі гэтакі вывад: як-жа мала між сабой знаюцца даўнейшыя валадары свайго краю: Літоўцы, Беларусы і Украінцы і як мала знаюць сваю слаўную мінуўшчыну. Вялікая пара жывей узяцца да ўзаемнага супрацоўніцтва, да жывейшай працы над супольнай мінуўшчынай!

Z.

З Беларускага жыцьця.

Выступленьне Беларускага Пасольскаго Клюбу ў польскім сойме. У часе разваханьня сойму над урадавым праектам буджэту, дня 6 г.м. ад імя Бел. Пас. Клюбу прамаўляў пас. Ярэміч. Прамову пас. Ярэміча будзем зьмяшчаць у наступных нумарох „Б. Крыніцы“.

Зацьверджаньне канфіскаты № 8 „Шляху Моладзі“. Рэдакцыю „Шляху Моладзі“ адміністрацыйныя улады паведамілі, што Акружны Суд зацьвердзіў канфіскату № 8 „Ш. М.“. Рэдактар Пецюкевіч будзе атказываць прад судом паводле распараджэньня Прэзыдэнта з 10.V. 1927 і 129 арт. К. К.

Новая кніжка „Rodnaja mowa ŭ światyniach“ Кс. Ад. Станкевіча. У мінулым тыдні выйшла з друку вельмі популярная кніжыца „Rodnaja mowa ŭ światyniach“. Гэная кніжыца мае 200 бачын. Зьмест яе гістарычны аб беларускай мове ў сьвятынях. Цана 2 зл. Прадаецца ў ва ўсіх беларускіх кнігарнях. Галоўны склад: кнігарня „Пагоня“, Вільня, Людвісарская 1.

Беларускі Праваслаўны Царкоўны Камітэт. У апошніх часах паўстаў у Вільні Беларускі Праваслаўны Царкоўны Камітэт, заданьнем якога ёсьць здабыцьцё належных правоў беларускай мове ў праваслаўнай царкве.

„Наперад“—орган беларускай санацыі (полёнофілаў). Кучка віленскіх беларускіх палітычных банкротаў на чале з ведамым прахадзімцам палітычных ар'ентацыяў Антонам Луцкевічам, атрымаўшы цяпер спадчыну па ведамых палітычных нябожчыках: Аляксюку, Ваўэйшу, Паўлюкевічу, Вярнікоўскім і інш. полёнофілаў, пачала выдаваць сваю часопісь пад назовам „Наперад“. Першы нумар гэтай часопісі паказаўся ў сьвет 12 г. м. і адразу запахнуў дэфэнзыўным даносам і пры тым няўдалым. Але да яе вернемся ў чародным нумары „Б.-Крыніцы“.

Арышт вучняў Віленскай Беларускай Гімназіі. У суботу, 7 сьнежня, у Вільні адбываліся пахароны Ю. Юхны, сябры Т-ва Беларускае Школы, б. грамадоўскага дзеяча. На магіле была зроблена палітычная маніфэстацыя, якую разагнала паліцыя. Пры гэтым арыштаваны 46 асоб, у тым 6 вучняў Віленскай Беларускай Гімназіі з 5 і 6 клясы, прымаўшых учасьце ў пахаронах.

Гаспадарка ў Саўгасах.

Саўгасы—гэта, коратка, тое самае, што сівецкія гаспадаркі. Саўгасы паўсталі з тых двароў, якіх камуністы не хацелі дзяліць паміж сялян, але зрабілі з іх „казённыя“ двары, якія мелі дастаўляць у горад збожжа, малако і розныя прадукты.

Мы заўсёды пісалі, што саўгасы і калгасы (калектыўныя гаспадаркі), як камуны, ніколі не прынясуць тэй карысьці, якую прыносяць паадзіночныя сялянскія гаспадаркі, дзе людзі працуюць кожны для сябе. Так яно і сталася. У менскай газэце „Сав. Беларусь“ (№ 260 16.XI.29) мы чытаем апісаньне нейкага Зайцава аб саўгасах належачых да Менсельпрому (Менская сельская промысьлу) і паложаных тут-жа пад самым Менскам.

В. Зайцаў вельмі моцна крытыкуе парадкі ў тамашніх саўгасах і кажа, што яны „павінны былі-б мець высока інтэнсыўную форму гаспадаркі: гародніцтва, садаўніцтва і малочную гаспадарку, бо рынак збыту — горад знаходзіцца пад носам...

На практыцы-ж у Менсельпрома ў прыгародных саўгасах гаспадарка вядзецца так, як у якім небудзь Вягомльскім, Плешчаніцкім і іншых далёкіх ад рынкаў збыту раёнах. Досыць сказаць, што сёлета пад гароднімі культурамі ў Менсельпрому было занята толькі 16 гэктараў з агульнай плошчы каля 600 гэкт.“

Далей В. Зайцаў пераходзіць да агляду саўгасу, які завецца „Тіволі“, Вось-жа ў гэтым саўгасе здымаюць 2 ураджаі аўса ў год! „Вас, таварыш чытач — піша Зайцаў — зьдзівіць такое дасягненьне ў галіне сельскай гаспадаркі. Вы скажаце, што аб такіх посьпехах трэба крычаць на ўсю БССР і нават больш.

Так, нас таксама вельмі зьдзівіла, калі на палёх гэтага саўгасу мы забачылі вялізарныя скірды, складзеныя ў выглядзе ні то вярблюда, ні то нейкіх невялічкіх гор з далінамі.

Падыходзім бліжэй, аказваецца — гэта ў такія скірды складзен гаспадарамі саўгасу авёс. Падходзім яшчэ бліжэй, — бачым цэлае цуда... Авёс у скірдзе прарос і даў расткі ў 10—12 і больш сэнтымэтраў, нават болш таго — маладзі авёс зьбіраецца каласіцца. Вось вам і новая сыстэма Менсельпрому для зьняцьця двух ураджаяў у адзін год.

У выніках такой сыстэмы авёс прарос, папрэў і адным чынам ураджай амаль загінуў. Прыблізна ў такіх-жа скірдах ляжала і жыта, можа ў крыху лепшых умовах.

Асабліва яшчэ падабаліся нам у гэтым саўгасе цяляты,— бегаюць такія прыгожанькія... Ногі тонкія, шыя як саломінка, а бруха як пузыр...

Адным словам „культурнасьць“ і „гаспадарчасьць“ у саўгасе кідаецца ў вочы амаль на кожным кроку“.

Потым пераходзіць Зайцаў да крытыкі другога саўгасу „Людамант“, дзе знаходзіцца пладавы пітомнік маладых дрэўцаў. Тут ужо Зайцаў страшыць гаспадароў саўгасу крымінальным кодэксам і пракуратурай — „Вам патрэбны факты? — пытае Зайцаў — калі ласка“.

„У 1928 годзе было заакуліравана 48000 дзічкаў, з якіх прынялося толькі каля 10 проц. Між тым, як кажуць спэцыялісты, павінна было прыняцца мінімум 90 проц., зразумела, пры гаспадарчай пастаноўцы працы.

Тэхніка вырашчываньня пладовых дзераўцаў самая барбарская...

Так, так, самая барбарская. Нават цёмны селянін у сваім садзе сучкі абрэзвае ножніцамі або нажом, а ў пітомніку саўгасу „Людамант“ яны, замест нажа, абломваюцца проста... рукамі...

У выніку такога „культурнага“ вядзеньня пладовага пітомніку, апошні страціў усялякую каштоўнасьць. Кажуць, што ў гэтым пітомніку не знайшлося амаль ніводнага больш-менш правільна вырашчанага дрэўца. Сапраўды, чым не безабразная пастаноўка працы“.

Але „найлепшыя“ парадкі Зайцаў знайшоў у саўгасе „Весялоўка“, дзе была пабудавана абора на 2 паверхі, якая каштавала 15.000 рублёў.

„Аўтар ідэі пабудовы такога скотнага двара, відавочна, жадаў ня толькі дагнаць, але і перагнаць Амэрыку. Як мы ўжо зазначылі, скотны двор двухпавярховы, прычым другі паверх прызначан для жывёлы, а першы — для хаваньня карняплодаў. Папершае, пры такіх умовах хаваньня карняплоды, яны безумоўна будуць псавацца, а падругое — такая „конструкцыя“ значна ўдаражыла кошт пабудовы“.

Так гаворыць Зайцаў. Але нас дзівіць яшчэ адна справа: як маглі каровы хадзіць на другі паверх? Няўжо па сходах? А можа была якая вінта? Цікава!

Але ініцыятар пабудовы такога „палацу“ для кароў, аграном Якубовіч, які скончыў савецкую аграномічную школу, задумаў там завесьці яшчэ „паравое атапленьне“. Аднак „таварыш“ Зайцаў высьмейвае яго і дае яму такую раду:

З Польшчы.

Паседжаньне Сойму і адстаўка ўраду. У мінулы чацьвер 5 г. м. сойм сабраўся і паседжаньне адкрыта. У той самы дзень польская ўрадавая апазыцыя і асобна ад польскай апазыцыі — украінскі і беларускі пасольскія клюбы падалі прапазыцыю выражэньня для ўраду недаверу. На другі дзень г. зн. 6 г. м. сойм вялікай большасьцяй галасоў ухваліў выражэньне недаверу для ўраду п. Сьвітальскага. Пасьля выражэньня недаверу — урад п. Сьвітальскага падаўся ў адстаўку. Прэзыдэнт адстаўку ўраду прыняў і даручыў яму спаўняць свае абавязкі тымчасова, пакуль ня ўтворыцца ўрад новы. Хто будзе тварыць новы ўрад і хто стане на чале ўраду, яшчэ пакульшто няведама. Кажуць, што марш. Пілсудзкі ўлады з сваіх рук ня пусьціць. Але Прэзыдэнт ужо заклікаў маршалкаў сойму і сэнату і нараджаўся з імі ў справе, вытварыўшайся ўрадавым крызысам. Вядуцца нарады так-жа і з прадстаўнікамі соймавых апазыцыйных клюбаў. Які будзе новы ўрад і ці зьменіцца сыстэма ўрадаваньня — пакажа будучыня.

Безрабоцьце. Паводле падлічэньня дзяржаўнага ўраду пасярэдніцтва працы ад 9 да 16 лістапада с. г. зарэестравана 105 556 безработных. У параўнаньні з папярэднім тыднем безработных прыбыло на 5 494 асобы.

З Заграніцы.

У С.С.Р.Р. як мы ўжо ня раз пісалі, у апошнія часы пачалася праводзіцца так зв. „чыстка“ камуністычнай партыі, прастаньне камуністычнай лініі і „хлебазатоўка“ — рэквізыцыя збожжа ў сялян. У выніках гэтай „працы“ — бальшавікі за месяц лістапад с. г. „вывелі ў расход“ — растралялі 206 чалавек.

Паводле кляс растрэлена: — сялян 173, савецкіх урадаўцаў 26, духоўнікаў 4, гандляроў 2, б. генэралаў 1.

З гэтай статыстыкі даецца заўважыць, што найбольш вылучанай з пад права ў С.С.Р.Р. гэта будзе кляса сялянская, якая там цяпер найбольш варожа настроена да камуністычных парадкаў.

Апрача гэтых растрэлаў, якія бальшавікі выканалі ў працягу толькі аднаго месяца, быццам дзеля дабра працоўных масаў, чырвоная армія, часова ўвайшоўшы на хінскую тэрыторыю ў Манджурыі, растраляла ў тым-жа месяцы лістападзе 150 чалавек расейскіх каляністаў, якія выехаўшы з Расеі, аселі каля расейска-хінскай граніцы.

Арыштаў падлічыць точна немагчыма. Арышты дзесяткамі, сотнямі і паадзіночныя адбываліся па ўсей тэрыторыі С.С.Р.Р.

У Радавай Украіне арыштавана ў працягу м. лістапада 140 чалавек, якія быццам належаць да „Саюзу Вызваленьня Украіны“

У Ленінградзе выкрыта канспірацыйная арганізацыя „Воскресенскія“, дзе таксама не абышлося без арыштаў, але пакульшто лік арыштаваных дакладна няведамы.

Бальшавікі ўзялі ў палон 300 белагвардзейцаў. Маскоўская тэлеграф. агенцыя падае, што бальшавіцкае войска ў часе акупацыі ст. Манджулі ў Манджурыі ўзяло ў плен каля 300 белагвардзейцаў. Між палоннымі знаходзяцца і павадыры белагвардзэйскіх арганізацыяў і ведамы дарадчык пры хінскай арміі Маскароў.

Бальшавікі пэўне-ж расправяцца з гэтымі палоннымі па свойму.

Хатняя вайна ў Хінах. У сувязі з бальшавіцка-хінскім канфліктам у Хінах узноў разгарэлася хатняя вайна. Урадавае войска прад паўстанцамі становіцца бязсільным. Пагроза тамашнім чужаземцам узрастае. Дзеля гэтага амэрыканская эскадра, якая знаходзіцца на водах Азіі, атправіла часьць сваёй сілы ў Хіны.

Паседжаньне Лігі Народаў. Ліга Народаў на свае паседжаньне мае сабрацца 13 студня 1930 г.

„Адносна паравога „отопления“, так па нашаму гэта ня варта, лепш, т. Якубовіч, было-б паставіць у аборы некалькі чыгунных печак. Вы ўяўляеце сабе, паважаны аграном, які прыемны малюнак можна было-б застаць узімку ў вашай двухпавярховай аборы.

На двары, скажам, мароз 20 градусаў, а завея — у трох кроках нічога ня відаць, а ў аборы... каля печак сабраліся каровы — аб чымсі гамоняць, цялята трэскі падкідваюць, бык некую байку апавядае, а ў печках агенёк, абліззваючы языком дровы і трэскі, па ўсёй аборы такую цяплыню разносе, што нават ня вышаў-бы з яе... Проста любата... Ці ня праўда?

„Нажаль паравое „отопление“ нашаму Якубовічу не дазволілі рабіць, а да пячнога ён сам ня прыхільнік. Так і загінула багатая ініцыятыва вынаходцы. Ня далі чалавеку ўвесьці такое „новшество“, якога нават Амэрыка ня бачыла...

„І стаіць яна — абора двухпавярховая, стаіць помнікам „гаспадарчасьці“ Менсельпромаўцаў“.

Вось якія парадкі ў менскіх саўгасах. Калі гэта-ж робіцца каля Менску, пад носам цэнтральных уладаў, то што гаварыць аб далейшых саўгасах? Сапраўды, трудна было-б паверыць усяму гэтаму, каб чалавек ня чытаў у савецкіх газэтах!

Ад сябе мы хацелі-б парадзіць тамашнім уладарам: кіньце вы праводзіць камуну, падзяліце вы зямлю паміж сялян, дайце ім магчымасьць працаваць, а тады паглядзіце які будзе вынік. Напэўна ня будзе таго, што ў вашых саўгасах!

Да нас пішуць.

ПОЛЬСКІ ШКОЛЬНЫ ІНСПЭКТАР АБ ШКОЛЬНІЦТВЕ Ў ДЗІСНЕНСКІМ ПАВЕЦЕ.

Глыбокае, Дзісненскага пав. У нашым мястэчку 12 лістапада с. г. адбылося паседжаньне дзісненскага павятовага сойміку. На гэтым паседжаньні дзісненскі школьны інспэктар зрабіў цікавы даклад. Інспэктар у сваім дакладзе сказаў, што школы ў Дзісненскім павеце расплянаваны паводле нацыянальнасьці насельніцтва(?!). Школаў у павеце ёсьць больш 300. Беларускіх толькі 2. Утраквістычных г. зн. польска-беларускіх—7, а рэшта ўсе польскія.

Ці-ж сапраўды школы расплянаваны ў Дзісненскім павеце паводле нацыянальнасьці насельніцтва?

Як бачым з статыстыкі школьнай, паданай п. інспэктарам, дык сусім не паводле нацыянальнасьці насельніцтва школы расплянаваны, бо ў Дзісненскім павеце сярод беларускага мора палякі становяць вельмі малы працэнт (чыноўнікі, абшарнікі і асаднікі), а школаў беларускіх толькі 2 і 7 утраквістычных.

Далей у сваім дакладзе п. інспэктар жаліўся на ненармальнае зьявішча, што дзеці, скончыўшы такую школу, вельмі скора забываюцца ўсяго што навучыліся.

Трэба тут сказаць, што таго, чаго навучацца, не забываюцца, але вось увесь трагізм, што нашы дзеці ў польскай школе нічога навучыцца ня могуць, бо польская мова, якая ёсьць мовай навучаньня беларускіх дзяцей у польскай школе, ёсьць для вучняў не зразумелай. Вось гэта і ёсьць доказам, што школы расплянаваны не повадле нацыянальнасьці насельніцтва, як казаў п. інсьпэктар, а наадварот.

З гэтага бачым, што дзісненскі польскі школьны інспэктар ужо бачыць трагізм польскага школьніцтва на Беларусі, але чамусьці яму яшчэ не хапае адвагі заглянуць у прычыну гэтай трагэдыі і аб гэтым у імя праўды і пэдагогікі публічна заявіць.

Як бачым, пэдагогіка палітыкі не прызнае, аб гэтым ужо крыху ікнуў і дзісненскі польскі школьны інспэктар. Саль.

ЖЫЛІ РАНЕЙ, БУДЗЕМ ЖЫЦЬ І ДАЛЕЙ!

в. Дабучын, Пружанскага пав. Аб тым, што мы беларусы жылі даўней, сьведчаць гістарычныя факты. А аб тым, што будзем жыць і далей, сьведчаць сучасны адраджэнскі беларускі рух. Няма тае ўжо вёскі на Беларусі, а нават і хаткі, дзе-бы ня чутны былі словы — беларусы, Беларусь. Не зважаючы на тое, што сучасныя часы і нявельмі спрыяюць беларускаму руху, аднак ён пашыраецца і паглыбляецца. Як усюды, так і ў нас сяляне дамагаюцца для сваіх дзяцей роднай беларускай школы. Хоць надзеі мала, што цяпер яе атрымаем, але моцна верым, што некалі-ж ды здабудзем. А гэта вера ў лепшае заўтра — ужо ёсьць доказам, што жыць будзем і далей.

Малады беларус.

КРЫХУ АБ ЖЫЦЬЦІ ПРАВАСЛАЎНЫМ У МАЛАДЗЕЧАНСКІМ ПАВЕЦЕ.

Мыляўся-б той, хто сказаў-бы, што праваслаўныя беларусы Маладэчанскага павету ня веруючыя.

Аб глыбокай веры беларуса сьведчыць прывязаннасьць яго да царквы. Тое, што робіцца ў царкве і з царквой, не праходзіць міма вушэй нашага селяніна. Беларусы праваслаўныя ўжо таксама як і каталікі зьвяртаюць вялікую ўвагу на жыцьцё рэлігійнае. Многія сяляне ўжо гавораць аб патрэбе беларускай мовы ў праваслаўнай царкве. Але, як ведама, гэтыя гутаркі сялян далей вёскі не пашыраюцца, бо сьвяшчэньнікі аб гэтым ня толькі, што ня цікавяцца, але і чуць ня хочуць. Нічога дзіўнага, што між прыхаджанамі-сялянамі і сьвяшчэньнікамі няма належнага суіжыцьця.

Сьвяшчэньнікі жывуць сваім жыцьцём асобна, валкуючы расейшчыну і больш патульныя прывыкаючы да полышчыны, а прыхаджане-сяляне жывуць сваім жыцьцём беларускім. Такім чынам паміж сьвяшчэньнікамі і прыхаджанамі пануе падзел і нацыянальны і сацыяльны. З даўных часоў сьвяшчэньнікі на нашых землях прывыклі быць не апосталамі навукі Хрыста, а чыноўнікамі царкоўнай палітыкі і больш зьвярталі ўвагі на патрэбы гэтай палітыкі, чымсь на пашырэньне праўды Божай сярод сваіх прыхаджан. Гэтак было даўней, гэтак ёсьць і цяпер. Рожніца між даўнейшым і цяперашнім толькі тая, што даўней нашы сьвяшчэньнікі верна служылі ўсходу, а цяпер стараюцца служыць заходу. Рэч зразумелая, што гэтакі стан царкоўнай палітыкі ёсьць ненармальны. А гэтая ненармальнасьць раздзяляе шырокай мяжой сьвяшчэньнікаў на Беларусі ад іх прыхаджан сялян беларусаў.

Каб ня быць галаслоўным, зьвярну ўвагу чытача на адносіны сьвяшчэньнікаў да прыхаджан і прыхаджан да сьвяшчэньнікаў у Маладэчанскім павеце 1) ў Залесі 2) Маладэчне 3) Маркаве 4) Беніцы і 5) ў Крэве Ашмянскага пав. Той, хто бліжэй гэтых мясцовасьцяў жыве і хто гэтай галінай жыцьця цікавіцца, пэўне-ж гэта ўсё бачыць і належна аціняе.

На мой пагляд, дык не народ для царквы, а царква для народу. І мне здаецца—я ня мыляюся. А калі яно ёсьць так, што не народ для царквы, а царква для народу, дык трэба, каб на Беларусі царква была для беларусаў, а не для расейцаў—г. зн. у царкве, да якой належаць прыхаджане беларусы, павінны быць казаньні да народу не парасейску, а пабеларуску.

Праваслаўны беларус.

КРЫХУ АБ ЖЫЦЬЦІ НАШАЙ ВАКОЛІЦЫ.

Юрацішкі, каля Ліды, Валожынскага пав. Наша Юрацішская гміна належыць да павету Валожынскага. Да Ліды нам бліжэй і зручней. Чаму ўлады прылучылі нашу гміну да Валожына, дык мы ня ведаем. Мусіць дзеля таго, каб ня быў куртаты Валожынскі павет.

У нашай гміне ў засьц. Зялёнцы нядаўна паўстала з беларусаў польскае „кулко палафіцэраў.“ Хоць у гэтым „кулку“ ані афіцэраў, ані палафіцэраў і няма, але „кулка“ ёсьць. Нуі няхай сабе будзе, няхай сабе думаюць, што нешта-ж ды робіцца, а з гэтага „нешта“ — анічога ня робіцца, бо для рожных польскіх „кулкаў“ у нас грунт не адпаведны і яны тут не прыжываюцца.

У нас цяпер узялася за працу санітарная камісія, якая ходзіць па вёсках і трэбуе ад сялян, каб былі аббрукаваныя студні, брук пасыпаны пяском і ашаляваныя зрубы. Гэта камісія складаецца з паліцэйскіх і гмінных радных.

Камісія, дбаючы аб добрым здароўі людзэй, якое людзі могуць страціць ад нядобрай вады, многія студні закрыла і нямала спісала пратаколаў. Аб тым, што сяляне ня маючы сродкаў мець цёплую адзежу, добры абутак і пры тым належную, як чалавеку адпаведную ежу, могуць страціць здароўе і працаздольнасьць, камісіі прыглядацца мусіць ня сказана. Яна глядзіць толькі, каб наш чалавек не хварэў ад вады. Ну што-ж, добра й гэта. Усё-ж такі апека над нашым братам.

Каля нас большасьць праваслаўных, але віленскі польскі—каталіцкі арцыбіскуп Ялбжыкоўскі, каторы беларусам каталікоя забараніў чытаць „Б. Крыніцу" перадаў у суд і нашу царкву, каб ад нас яе адсудзіць. Ці адсудзіць ці не, аб гэтым цяпер сказаць трудна. Пры гэтым трэба сказаць, што беларусы-каталікі арцыбіскупскай забароны не паслухалі, як чыталі „Б. Крыніцу, так і чытаюць. Не здаволены нашыя беларусы-каталікі і з таго, што арцыб. Ялбжыкоўскі хоча адсудзіць нашу царку. Яны кажуць, што ў адсуджану ад іх братоў царку маліцца ня пойдуць, бо маюць свае касьцёлы.

Нашы дзеці ходзяць у польскую школу, дзе іх і пацераў вучаць папольску. Тут дык нядбайнасьць сьвяшчэньніка. К. С.

ПАЗНАЛІСЯ НА СПАДАРАУСКІМ „ЗЬВЯЗЕ"

Валожын. У нас ёсьць гурток Янкавага „Зьвязу". Да гэтага гуртка належаць толькі нешта аж 2 асобы. На гэтым гуртку трымаецца і Янкава кнігарня.

Кнігарня рэч добрая і патрэбная, але-ж трэба яе належна вясьці, а ня так, як кіруе Янка і вядзе яе. Кніжкі ў гэтай кнігарні ўдвая даражэй, як у Вільні. Гэта-ж немагчыма. На што-ж такая ахвота так скора збагацець і адразу панам стаць. Куды лепш было-б памаленьку і па троху зарабляць. А то ўсё адразу: і ўплывы Янкі праз „Зьвяз" і заработак на кнігарні. А з гэтага ўсяго можа быць анічога. „Зьвязь," як у нас гаворацъ „ужо скора ногі выцягне", бо сяляне, пазнаўшыся на гэтым „Зьвязе" каго ён хоча зьвязаць, — абмінаюць яго з далёк, а каб збагацець на кнігарні ў Валожыне, дык таксама трудна. Дай Божа, каб кнігарня сама сябе аплаціла. А каб кнігарня магла ўтрымацца, трэба кніжкі прадаваць не з вялікім заработкам, а старацца як можна больш іх прадаць. У гэтакі спосаб гандаль дае больш даходу і ніколі не ліквідуецца. Калі Янка ня ўмее гандляваць, дык няхай запытае ў нашых жыдкоў, яны ў гэтым яму не адмовяць, бо кнігарня для іх конкурэнціі ня робіць. Але Янка на кнігарню мусіць найменш зьвяртае ўвагі, яго ўвага зьвернена на выцягіваючы ногі „Зьвяз". На „Зьвяз" увагі зьвяртаць ужо ня трэба, бо ён памёр і ня жыве, а кнігарню падтрымаць дык трэба.

Валожынец.

Аб гаспадарцы.

Цяленьне кароў.

Жыцьцё так укладаецца, што на зімовыя месяцы ў нас прыпадае самы час цяленьня кароў. Дзеіцца пры гэтым шмат і шмат памылак, якіх трэба сьцерагчыся.

Цельную карову трэба добра карміць, але нельга яе перапіхаць т. зв. грубым пошарам (саломай, малавартым сенам), бо гэта сьціскае цялё, не даючы магчымасьці яму добра расьці і разьвівацца. Трэба затое часьцей дадаваць такой жывёле пошару густога (макухі, вотрубы). Небясьпечным бывае ў такой жывёлы ськівданьне, да якога могуць прывадзіць розныя прычыны, як напр. зімная вада на пойлу, сапсуты корм, удары і г. д.

Таму нельга ніколі паіць цельную карову вадой проста са студні: вада заўсяды мусіць „адстаяцца" (злеціцца). Шкодзіць цельнай карове сплесьнійшае сена, пачарнеўшыя буракі і бульба. Вельмі шкоднай зьяўляецца прарослая бульба. Ды і наагул цельнай карове нельга даваць бульбы больш, як 7—8 клг. на дзень.

Найменш чатыры тыдні прад ацяленьнем мусіць карова зарваць, каб адпачнуць.

Самае цяленьне мусіла-б, найлепш, адбывацца бяз людзкой помачы, бо „помач" гэта найчасьцей бывае проста шкоднай. Памагаць прыходзіцца толькі тады, калі цяленьне працягнецца на час даўжэйшы, як 2 гадзіны. Ды і то памагчы можа толькі асоба справу знаючая.

Па ацяленьні карову трэба напаіць цёплай пойлай (з вотрубаў, або з мукі). Звычайна карова шчышчаецца па ацяленьні ўжо цераз 12 гадзін. Калі-б працягнулася далей, даюць карове піць румянак, да каторага йшчэ дадаецца фунт — два цёртага ільнянога сямёньня на 3—4 л. вады.

Раз-на-заўсёды трэба ачвучыцца здаіваць карове малозіва, якое патрэбна цяляці на прачышчэньне кішок ад радзімай смолкі. У праціўным выпадку цялё хварэе на затрыманьне.

(З працаў інж. Ад. Клімовіча.)

Праўныя парады.

Ст. Яшкевічу.

Пытаньне: У судзе мой праціўнік пам і рыўся са мной на наступных варунках: дарога належыць да яго і да мяне, карыстацца маем права на раўні. Цяпер ён памёр, а яго жонка да карыстаньня дарогай мяне не дапускае. Ці магу вярнуць свае правы?

Адказ. Вазьміце з Суду копію таго міралюбнага рашэньня і перадайце праціўніка вашага ў Суд з просьбай вярнуць правы вашага ўладальня. Справу ў Судзе выйграеце.

Усячына.

Капітан Бырд даляцеў да паўднёвага полюса. З Нью-Ёрку паведамляюць, што капітан Бырд шчасьліва пераляцеў над паўднёвым полюсам і вярнуўся да свайго табару. Над паўднёвым полюсам Бырд парабіў цэлы рад дужа цікавых і важных памераў і здымак. Усё гэта будзе мець вялікае навуковае значэньне. На падставе прысланых Бырдам паведамленьняў, паўднёвы полюс распаложаны на вялікай высакароўні, што ўзвышаецца на 4 тысячы мэтраў над роўнем мора. Бакі гэтага ўзвышша ёсьць дужа стромкія.

Арганізацыя банды зладзеяў. Паведамляюць з Жоўквi (Украіна), што там выкрылі банду зладзеяў дужа спрытна арганізаваных.

Новыя вынаходы ў Пампэі. У часе раскопаў у Помпэі, якая была засыпана вульканам 2 тыс. гадоў таму назад, знойдзена шмат цікавых выкапліштчаў. Адкопана многа людзкіх шкелетаў, што згінулі, засыпаныя вульканічным попелам. Таму, што іх цела зусім спапялела, дык на тым месцы стварыліся парожныя месцы, якія пазьней пазаліваліся гіпсам, з чаго паўсталі статуі людзей у такой позе, у якой каго засыпаў вулькан.

Мара пагражае. Нябывалыя рэчы выпраўляе нейкі душагубнік. Вось нядаўна прыслаў ён лісты да некалькіх рэдакцыяў у акрузе Сары, дзе піша, што ён пераносіцца з Дюсэльдорфу ў ваколіцы места Сабрюкэн. У лістах перадусім пагражае паліцыі, якой ён ужо цэлыя дзесяткі зьнішчыў.

Гураган у Заходняй Эўропе. У апошнія часы над Заходняй Эўропай паднялася нябывалай сілы бура. Караблі на моры змагаючыся з бурай страцілі ар'ентацыю. Многія караблі паважна загрожаны небясьпекай. Каля берагу Валіі заўважана небывалае зьявішча: вялікую грамаду кітоў, прыгнаных з поўначы бурай. Аднаго кіта бура выкінула на бераг. Хвалі змываюць з пакладаў караблёў абслугу — маракоў. Бура перавярнула адзін касьцёл. Вялікай небясьпекай ёсьць падняцьце што раз то вышэй вады у рэках. У ніжэйшых ваколіцах людзі выяжджаюць з сваіх аселяў у больш вышэйшыя мясцовасьці.

Гэты гураган прычыніў ужо многа сьмяротных выпадкаў, топячы на моры маракоў і забіваючы на сушы людзей, падаючымі пад націскам сілы ветру, будынкаў.

Бацькі беларускіх дзетак! Ці вы не забыліся, што школьныя дэкляраццы падаюцца толькі да Новага Году? Не прапусьцеце-ж тэрміну, каб вашы дзеткі на вас не крыўдавалі!

Наша пошта.

В. Саўч. Просьбу Вашу спаўняем, карэспандэнцыю зьмесьцім. Апрача тых часопісаў, каторыя Вы ведаеце, іншыя не выходзяць.

С. Юралевічу. Грошы атрымалі, дзякуем. Адрэс школы будаўлянай знойдзеце ў „Нашай пошце" „Бел. Крыніца № 35.

Я. Зыгмунту. „Б. К." будзем пасылаць з 1.І.30 г. прысылайце падпіску.

Ул. Капаніку „Б. К." пасылаем з 1.І.30 г.

Я. Катарковічу. Адказ на Вашае пытаньне даём пісьмом

К. Каршуну. Газэту пасылаем з 1.XII. 29 г.

Ант. Брычнеўскаму. Адрэс школы будаўлянай пададзены у „Нашай пошце" „Бэл. Крыніцы" № 35; іншых падобных школаў у Вільні няма.

Ул. Дуброўскаму. Залеглыя нумары „Б. К." выслалі. З гэтага месяца будзем пасылаць рэгулярна.

Міх. Скарыньніку. Адказ выслалі адкрыткай.

Алекс. Кірэню. Газэту пасылаем.

Зорцы. З карэспандэнцыяў скарыстаем. Просьбу Вашу споўнілі. Пісьмо пісанае Вамі атрымала рэдакцыя „Шляху Моладзі"

„Акуляры". З нарэспандэнцыяў скарыстаем, дзякуем за прысканыя, пішыце больш.

Я. Гаўрыльчыку. Адказ на Вашу просьбу дамо пісьмом

Ко—ко. Верш даволі добры, зьмесьцім у сьвяточным нумары.

Фр. Храпану. Добра разгледзіўшы, магчыма што зьмесьцім Вашае апавяданьне. Газэту пасылаем акуратна, дамагайцеся на пошце.

Я. Казлук. Адказ дамо пісьмом.

Б. Сухажэўскаму. Просьбу Вашу споўнілі; газэту будзем пасылаць. Вашаму суседу спынем высылку.

Гр. Волчаку. Газэту пасылаем, прысылайце падпіску. „Сялянская Ніва" ня выходзе.

Э. Пятроўскаму. Грошы атрымалі, дзякуем.

Бюро „Wschód". Належнасьць атрымалі, дзякуем.

П. Т. Грошы атрымалі, газэту будзем пасылаць з 1. XII. с. г.

Танная прадажа беларускіх кніг.
БЕЛАРУСКАЯ КНІГАРНЯ «ПАГОНЯ»
(Вільня, Людвісарская № 1)

прадаўжае танную прадажу беларускіх кніг, якіх сьпіс кнігарня высылае, хто прышле на гэта марку на 10 гр.

Кнігарня на кожнай з празначаных для таннай прадажы кніг робе значную ўступку, а на некаторых уступае палавіну (50 проц.) Танная прадажа ўжо пачалася і будзе трываць да 15. І. 1930 г. Грамадзяне, пасьпяшыце скарыстаць з гэтай рэдкай аказіі.

увага: Кніжкі высылаюцца поштай па атрыманьні ўсей вартасьці заказу, або накладной платай (za pobraniem) па атрыманьні аднэй трэцяй часткі вартасьці заказу.

Лякарня Літоўскага
Т-ва
Санітарнае Помачы.
ў Вільні, Віленская вул. 28.

Прыймаюць дахтары спэцыялісты.—Адбываюцца ўсялякага роду опэрацыі. У лякарні аддзелы: унутраны, хірургічны, гінэколёгічны і радзільны.

Кабінэт Рэнтгэна і электра мэдычны.
Лячэньне праменьнямі, фатаграфаваньне, прасьвятляньне, элэктрычны масаж.

Прыймо ад гадз. 10 р. да 4 па пал.
Незаможным уступка.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны Вільня, Завальная 6—10. Выдавец Альбін Стэповіч